# АДНАДУШНА АДАБРАЕМ ЛЕНІНСКУЮ ПАЛІТЫКУ КПСС

Разам з усімі савецкімі людзьмі горача вітаюць пасланцоў сусветнага камуністычнага руху студэнты, выкладчыкі і супрацоўнікі Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Яны пільна сочаць за работай маскоўскай Нарады, выказваюць пажаданні поспехаў ва ўмацаванні адзінства і згуртаванасці ўсіх радоў камуністычнага і рабочага руху. У Маскву, у адрас міжнароднай Нарады ідуць пісьмы і тэлеграмы з універсітэта, два пісьмы мы сёння друкуем.

## ГАЛОЎНАЕ — АДЗІНСТВА

**Міжнародная Нарада камуністычных і рабочых партый — гэта яшчэ адзін удар па імперыялізму і яго прыспешніках, якія накіроўваюць усе намаганні на раскол камуністычнага і рабочага руху. Умацаванне адзінства рэвалюцыйнага руху — справа сусветна-гістарычнага значэння.**

**Мы выказваем упэўненасць, што міжнародная Нарада, якая праходзіць у Маскве, выканае сваю гістарычную місію, будзе рашаючым этапам ва ўмацаванні згуртаванасці і адзінства дзеянняў міжнароднага камуністычнага і рабочага руху у інтарэсах міру, дэмакратыі і сацыялізма.**

**Цяперашняя Нарада яшчэ раз яскрава дэманструе на практыцы плённасць інтэрнацыянальнага супрацоўніцтва камуністычных і рабочых партый. Ленінскія ідэі аб міры і дружбе, нацыянальна-вызваленчым руху народаў пераможна крочаць па планеце. Напярэдадні 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна камуністычныя і рабочыя партыі, якія сабраліся на Нараду, яшчэ раз прадэманструюць ажыццяўленне ленінскіх ідэй.**

**Мы жадаем поспехаў у рабоце Нарады камуністычных і рабочых партый, якая ўнясе вялікі ўклад у справу згуртавання міжнароднага камуністычнага руху на прынцыпах марксізма-ленінізма, пралетарскага інтэрнацыяналізму.**

*Студэнты, аспіранты, выкладчыкі і супрацоўнікі Беларускага ордэна Працоўнага Чырвонага Сцяга дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна.*

## ВЕРНАСЦЬ ПРАЛЕТАРСКАМУ ІНТЭРНАЦЫЯНАЛІЗМУ

**Ад усяго сэрца падтрымліваю адказную і пачэсную работу міжнароднай Нарады камуністычных і рабочых партый. Поўнасцю адабраю выступленне на Нарадзе Генеральнага сакратара ЦК КПСС Л. І. Брэжнева, у якім выказаны думкі і пачуцці савецкіх камуністаў, усіх працоўных нашай Радзімы, што адчуваюць сябе неад'емнай часткай сусветнага камуністычнага і рэвалюцыйнага руху. Ад імя шматтысячнага калектыву універсітэта горача віншую ўдзельнікаў Нарады і выказваю поўную упэўненасць, што яна паспяхова выканае сваю гістарычную місію — з'явіцца важным этапам на шляху мабілізацыі ўсіх рэвалюцыйных, вызваленчых і прагрэсіўных сіл сучаснасці для барацьбы з імперыялізмам, яшчэ цясней згуртуе міжнародны камуністычны рух на базе марксізма-ленінізма і пралетарскага інтэрнацыяналізму.**

*А. Н. СЕЎЧАНКА, акадэмік АН БССР, доктар фізіка-матэматычных навук, рэктар універсітэта.*

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Беларускі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, МЯСЦКОМА, КАМІТЭТА КАМСАМОЛА І ПРАФКОМА БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

№ 21 (750) ● Пятніца, 13 чэрвеня 1969 г. ● Цана 2 кап. ● Год выдання XXII



*Наш фотакарэспандэнт М. Нечыпарэнка пабываў на біялагічным факультэце ў час абароны дыпломных работ. На яго здымку вы бачыце выпускніцу В. Гайцан.*

# НА ПРАВЕРЦЫ — ВЕДЫ

## ХВАЛЯВАННІ ПРАЦЯГВАЮЦЦА

Звычайна, калі выкладчык аддае экзаменацыйныя ведамасці ў дэканат, можна зразумець, ці задаволен ён сваім працоўным семестрам і работай студэнтаў. Аркадзь Іосіфавіч Наркевіч радасна ўсміхаецца, хоць і многа клопатаў прынёс яму цяперашні другі курс журфака. Беларускую мову многія да паступлення ва універсітэт зусім не вывучалі або рабілі гэта вельмі нядобрасумленна. А працаваць жа давядзецца ў рэдакцыях рэспублікі, дзе большая частка газет выдаецца на беларускай мове. Аркадзь Іосіфавіч прад'яўляе сур'ёзныя патрабаванні да студэнтаў, без усякіх скідак. У мінулым годзе на першым курсе было сем нездавальняючых адзнак, а ў гэтую сесію — толькі адна. А выдатных адказаў стала ў два разы больш.

На трэцім курсе група радыё і тэлебачання здае экзамен па спецыяльнаму прадмету. У гэтым годзе студэнты вывучалі зарубежныя радыё і тэлебачанне. «Але акрамя ўмення пісаць,—гаворыць выкладчык В. Н. Шэін,—радыё- і тэлежурналісты павінны ведаць тэхнічны бок сваёй работы». У экзаменацыйныя білеты ўваходзяць пытанні па будове гуказапісваючай апаратуры і тэлеўстановак.

Кафедра існуе толькі другі год, і можа таму пры выбары спецыялізацыі некаторыя студэнты ваганіся, чаму аддаць перавагу—газеце ці радыё і тэлебачанню. Для Анатоля Аўчарэнкі і Валерыя Рыдкага гэтае пытанне было даўно вырашана: вядома ж—тэлебачанне. Выкладчыкі лічаць, што студэнты многага ўжо дабіліся, і зусім не выпадкова ў заліковых кніжках у іх пяцёркі па будучай спецыяльнасці.

Першакурснікі хутка стануць на курс старэйшымі. За год яны пра многае даведаліся, сталі больш упэўненымі. Рабяты тут вельмі розныя: адны трапілі на студэнцкую лаўку пасля школьнай, іншыя пасля доўгай праверкі сваіх сіл у рэдакцыях раённых газет, у калгасах, на заводах. На экзамене па гісторыі рускай літаратуры XIX стагоддзя паказалі сябе начытанымі, добра падрыхтаванымі. Нездавальняючых адзнак няма. А трэцяя частка студэнтаў атрымала найвышэйшую ацэнку.

Толькі 7 чэрвеня закончыліся апошнія хваляванні на выпускным чацвёртым курсе. Члены дзяржаўнай экзаменацыйнай камісіі асабліва былі задаволены адказамі Святланы Мельнікавай і Надзежды Сакаловай.

Хутка з дыпломам, гордыя званнем журналіста раз'едуцца яны па ўсёй нашай рэспубліцы. Адны будуць доўга памятаць экзамен па гісторыі бальшавіцкага друку, які давялося здаць толькі за трэцім-чацвёртым разам свайму патрабавальнаму дэкану Р. В. Булацкаму, іншым, здавалася, недасягальную беларускую мову, але нікога са студэнтаў слова «сесія» не пакіне раўнадушным.

**В. ГУДОВІЧ,**
сакратар дэканата журфака.

## ГАРАЧАЯ ПАРА

На хімфаку, як і ўсюды ва універсітэце, бурліць сесія. Пара гэта аднолькава гарачая як для студэнтаў, так і для выкладчыкаў.

У 55-й аўдыторыі першакурснікі здаюць экзамен па неарганічнай хіміі дацэнту Галіне Ігнацьеўне Васільевай. Больш спакойныя, чым паўгода назад, тым не менш...

— Як прымае?

— Нядрэнна...

А цяпер пытаемся ў Галіны Ігнацьеўны:

— Як здаюць?

— Нядрэнна.

— А якія адзнакі?

— Першай адказвала І. Янкоўская. Атрымала «выдатна». І гэта заканамерна. На працягу года яна займалася добра, часта выступала на семінарах. А вось Хаўратовіч з цяжкасцю атрымала «здавальняюча». Таксама не дзіўна. Слаба займалася на працягу года.

У гэтым годзе студэнтам-першакурснікам упершыню ў курсе неарганічнай хіміі былі дадзены асновы тэрмадынамікі. Вельмі радуе, што іх першае знаёмства з паняццямі і законамі гэтай галіны аказалася ўдачным.

І так, у першакурснікаў усё ў парадку. А як справы ў студэнтаў чацвёртага курса? Яны ж здаюць сваю апошнюю сесію. Пасля — практыка, дыпломная работа, абарона і... работа па спецыяльнасці. Гутарым з намеснікам дэкана дацэнтам Г. А. Браніцкім:

— У гэтым годзе для студэнтаў чацвёртага курса ўпершыню была ўведзена спецыялізацыя па хіміі паўправаднікоў. У гэтай групе вучылася 25 студэнтаў. Лекцыі для іх чыталі фізікі, хімікі, запрошаныя спецыялісты.

Гэтым летам студэнты ўпершыню здавалі экзамен па хіміі і фізіцы паўправаднікоў. Вынік выдатны. Усяго тры добрыя адзнакі, астатнія адказы ацэнены вышэйшым балам. Студэнты былі падрыхтаваны настолькі добра, што цяжка выдзеліць лепшых. Вось што значыць сапраўдная зацікаўленасць прадметам!

Сесія працягваецца. У калідоры тоўпяцца студэнты. Смех і слёзы. Удачы і нездавальненні. Ідуць экзамены. Правяраецца якасць вучобы.

**Г. КАЖУШКОЎ,**
асістэнт кафедры неарганічнай хіміі.

Шчаслівы білет выцягнуў студэнт III курса матфака А. Шынцоў, якога вы бачыце перад сталом экзаменатара. Дацэнт М. У. Піскуноў ацаніў яго веды па педагогіцы на выдатна.
Фота **М. НЕЧЫПАРЭНКІ.**





# РАЗВЕДЧЫЦА ТАНЯ ГУК

## Так змагаліся з ворагам выхаванцы універсітэта

*7 чэрвеня ў газеце «Известия» пад агульнай назвай «Белорусская Таня» былі надрукаваны ўспаміны баявых сяброў і родных аб разведчыцы І-й Беларускай партызанскай брыгады Таццяне Пятроўне Гук—былой выпускніцы нашага універсітэта. Аб подзвігу гэтай мужнай савецкай патрыёткі вядома пакуль што мала. Рэдакцыя газеты «Беларускі універсітэт» звяртаецца да прафесараў, усіх выкладчыкаў, у якіх займалася Таня, да яе аднакурснікаў з просьбай падрабязна расказаць на старонках шматтыражкі аб жыцці і вучобе Т. П. Гук.*

**Таня Гук нарадзілася ў 1909 годзе ў Мінску. Яна была чацвёртай у сям'і чыгуначнага стрэлачніка. Нястачы, якія праследавалі сям'ю кожны дзень, сталі асабліва адчувальнымі, калі бацьку за ўдзел у забастоўцы звольнілі з работы. У пошуках кавалка хлеба Пётр Гук адпраўляецца за акіян, у Амерыку. Але і там ён не знайшоў шчасця, памёр на чужыне беспрацоўным.**

**«У доме — хоць шаром пакаці, грошай ні капейкі. А жыць трэба», — успамінае аб тых днях сястра Тані Марыя. Маці аддала Таню сваёй бяздзетнай сястры, Веру і Марыю — другім сёстрам, а старэйшага Паўліка ўзялі на работу ў вёску. Перад першай сусветнай вайной сям'я пераехала ў Екацярынаслаў, але і там прыйшлося галадаць.**

**Пасля вяртання на радзіму ў 1921 годзе Таня працавала пастухом у Петкавічах і зімой жыла ў вёсцы, нават наведвала школу, куды даводзілася хадзіць за кіламетраў сем. Нарэшце яна паступае ў вопытна-паказальную школу пры Белпедтэхнікуме ў Мінску. Закончыла яе на выдатна і была накіравана на двухгадовыя педагагічныя курсы. Камсамолка марыла стаць настаўніцай, і яе мара здзейснілася. На працягу трох год Таня працавала ў адной са школ Быхаўскага раёна. Тут яна стварыла камсамольскую арганізацыю, гурток мастацкай самадзейнасці, актыўна ўдзельнічала ў грамадскім жыцці.**

**Цяга да ведаў прывяла дзяўчыну ў 1931 годзе ў Беларускі дзяржаўны універсітэт. У 1935 годзе атрыман дыплом — і зноў у школу. Спачатку Таццяна Пятроўна выкладае ў лясным тэхнікуме ў Барысаве, затым у сярэдняй школе. Вось як успамінае пра яе заслужаная настаўніца БССР Марыя Мазінг, якая працавала там жа ў школе, а ў час акупацыі была ўключана Таняй у разведгрупу: «Былі мы калегамі — у адной школе вучылі. Прыемная была жанчына: разумная, дзелавая, прыгожая. Часта даводзілася бываць на яе ўроках. Хімію яна ведала выдатна. Рабяты яе любілі. Таня вельмі захаплялася і літаратурай, любімым паэтам яе быў Маякоўскі. На адным са школьных вечароў напярэдадні вайны яна чытала паэмы «Уладзімір Ільіч Ленін» і «Хорошо». У зале стаяла цішыня, а калі Таня закончыла — бура апладысментаў».**

**Барысаўчане выбралі камсамолку дэпутатам гарадскога Савета, у Барысаве яна стала камуністкай, тут да яе прыйшло і асабістае шчасце.**

**І вось вайна. Муж Таццяны Пятроўны Ф. З. Дзягель пайшоў на фронт, а яна стала шукаць тых, хто дапамог бы ў барацьбе з ворагам тут, на Барысаўшчыне. Так Т. П. Гук аказалася ў штабе 1-й Беларускай партызанскай брыгады. Яна сама папрасілася ў разведку. Жанчыну накіравалі ў Барысаў. За кароткі тэрмін ёй удалося стварыць невялікую баяздольную разведгрупу, у якую ўвайшлі сёстры Ніна і Анастасія Кошкіны, Аляксандра Ляшкевіч, Соф'я Ржэўская, Сцяпан Садоўскі і іншыя савецкія патрыёты. Праз сувязнога Аляксандра Малчанскага яны сістэматычна перадавалі партызанам неабходныя звесткі пра ворага. «Інфармацыю мы атрымлівалі шырокую, — расказвае былы намеснік камандзіра брыгады Серафім Бабянкоў. — І аб колькасным саставе гарнізона, і нумары вайсковых часцей, і характарыстыку афіцэрскага корпуса, і графікі руху паяздоў з тэхнікай і зброяй, і спісы здраднікаў».**

**Паязды, якія былі пушчаны пад адхон, аэрадром, іншыя гітлераўскія аб'екты, ператвораныя партызанамі ў руіны, сотні забітых фашыстаў — вось далёка не поўны пералік баявых спраў, здзейсніць якія дапамагала Таццяна Пятроўна Гук.**

**Гестапаўцы здагадваліся аб тым, што ў Барысаве дзейнічаюць разведчыкі. Яны кінулі ўсе сілы, каб напасці на след. У снежні 1943 года Таня Гук была арыштавана. На працягу некалькіх месяцаў яе дапытвалі, катавалі... Патрыётка нічога не сказала ворагам. Яе расстралялі за два тыдні да вызвалення Барысава Савецкай Арміяй.**

Да 25-годдзя вызвалення Беларусі

# СТУДЭНЦКІЯ ПЕРАКЛАДЫ



**На старонках рэспубліканскіх газет і часопісаў са сваімі вершамі часта выступае студэнтка ІІІ курса філалагічнага факультэта Яўгенія Янішчыц. Значнае месца ў творчасці маладой паэтэсы займаюць і пераклады з іншых моў. Сёння ў яе перакладах мы прапануем увазе чытачоў некалькі вершаў вядомых украінскіх літаратараў Уладзіміра Руткоўскага і Івана Гнацюка.**

### Уладзімір РУТКОЎСКІ

Прыйдзі, як подых.
Прыйдзі сягоння
На дзень святочны,
на велікодны.
Прыйдзі сягоння адна
з любові,
Бо я, як човен,
вадою повен.
Бо без цябе я—
маўклівы камень
На бездарожжы паміж
вякамі,
Дзе кожны погляд мяне
асудзіць,
І кожны камень цаляе
ў грудзі.
На вусны й вочы,
на грудзі й рукі
Накінь кайданы
свяшчэннай мукі.
Ад дум глыбінных
я ўжо нямею...
Прыйдзі сягоння,
бо я не ўмею.
Прыйдзі сягоння
святлом і летам.
Асеннім громам,
зялёным ветрам.
Адкуль ты прыйдзеш —
таго не знаю —
Ад гор чакаю,
ад зор чакаю.
Прыйдзі, прыйдзі сягоння
На дзень святочны,
на велікодны.

### Іван ГНАЦЮК

Ён закаханы быў у коней
І чуў, як гліна — дзіва
з дзіў—
Жарэбкам дыхала
ў далонях,
Калі ён конікаў ляпіў.
Ніхто не бачыў, як натхнёна
Дзесь па-за спінамі хатуль
З любоўю гладзіў рыжых
коней
І вылятаў на іх адтуль.
А ўслед гады, нібы ў
гарачцы,
Храплі, капытамі б'ючы
Усе сумненні і няўдачы.
І думы — ўдзень,
І сны — ўначы.
Не супыніўшы іх пагоні,
Падаўся ў свет. І шумны век
Масты з любоўю, нібы
коней,
Гайдаў над вірам буйных
рэк.
І гладзіў грудзі іх бетонныя,
І доказ быў да хрыпаты,
Што зухавата на пантонах
На дыбкі ўскокваюць масты.
І, адслужыўшы век, як
рыцар,
На старасць жыў сабе
адным
Святым жаданнем, каб,
як лічаць,
Услед каня вялі за ім.
Хай без ікон, без труб
жалобных,
Ды толькі конь,
як спелы дзень...
І вось нясуць яго.
Аўтобус
Павольна йдзе за ім, як
цень.

# ЦІКАВЫ АДПАЧЫНАК

Сесія — самая напружаная і адказная пара ў студэнцкім жыцці. Безумоўна, пасля нялёгкай працы заўсёды патрэбен добры адпачынак. Як звычайна, цікавым і разнастайным ён будзе ў час летніх канікул у студэнтаў нашага універсітэта. Правільна лічаць многія, што лепшым адпачынкам пасля разумовай працы з'яўляецца фізічная загартоўка. І адны выязджаюць на цалінныя будоўлі, працуюць у інтэрнацыянальных атрадах, дапамагаюць мінскім заводам, калгасам і саўгасам рэспублікі. Іншыя адпраўляюцца ў турысцкія падарожжы па краіне. Больш 75 чалавек з універсітэта будуць адпачываць у студэнцкім прафілакторыі. Некаторыя выедуць туды яшчэ ў час сесіі. Нашу моладзь чакаюць і студэнцкія дамы адпачынку. Там паселяцца 50 чалавек. 350 савецкіх і замежных студэнтаў з БДУ будуць умацоўваць сваё здароўе і спартыўнае майстэрства ў спартыўна-аздараўленчым лагеры на возеры Нарач. Як заўсёды, тыя, каму патрэбна паправіць сваё здароўе, атрымаюць пуцёўкі ў санаторыі краіны.

**Л. САБАЛЕЎСКІ,**
**старшыня прафкома.**



*Над Свіслаччу.* *Фотаэцюд А. ЛАСМІНСКАГА.*

# ЛЕТНІМІ МАРШРУТАМІ

*Цяперашняе лета турысты і альпіністы універсітэта праводзяць пад сцягам падрыхтоўкі да 100-годдзя з дня нараджэння У. І. Леніна.*

*У нядзелю ў мотапрабег па ленінскіх месцах выходзіць першая група. Канчатковая мэта іх падарожжа — сяло Шушанскае.*

*Як заўсёды, разнастайнай з'яўляецца геаграфія турысцкіх паходаў. Летам нашы студэнты пабываюць на Алтаі, дзе праводзяцца зборы, прысвечаныя юбілейнай даце, на Урале, на Каўказе і, вядома, у Беларусі.*

*Каля 15 захапляючых маршрутаў па ўсёй краіне чакаюць універсітэцкіх турыстаў.*

**А. ЛЮЦКО,**
**старшыня секцыі турызма-альпінізма.**

# СТРАКАТАЯ СУМЕСЬ

**● У АДНЫМ ЛОНДАНСКІМ рэстаране кожнаму госцю, які пры ўваходзе паказвае білет у тэатр, уручаецца флажок. Паяўленне такога флажка на стале абавязвае афіцыянта абслужыць сядзячых без чаргі. Адным словам, хочаш хутчэй паесці — купі білет у тэатр.**

**● РОД ПІЛ, ПАЛЯЎНІЧЫ з Сіракуз, выйшаў са сваім сабакам на паляванне. На ўскраі лесу сабака выпадкова натрапіў на гняздо аваднёў і патрывожыў насякомых. Яны ўсім роем кінуліся на яго. Няшчасная жывёліна спрабавала ратавацца бегствам, але авадні дваццаць кіламетраў гналіся за парушальнікам іх спакою, не пакінуўшы яго і дома. Калі праз некалькі гадзін вярнуўся гаспадар, ён застаў паўмёртвага сабаку і поўны дом аваднёў, якія адразу ж накінуліся і на чалавека. Толькі ўмяшанне пажарных, узброеных дэзінфекцыйнымі апаратамі, дапамагло ачысціць дом ад упартых мсціўцаў.**

**● БРАЗІЛЕЦ ПАУЛО ДАУРЫЛ, балельшчык футбола, на матчах атрымаў дваццаць чатыры раненні, не лічачы мноства драпін. Дваццаць раз ён выклікаўся на бойкі, двойчы пад ім правальваліся трыбуны стадыёна, чатыры разы яго збівала паліцыя. Нарэшце, апошнюю рану яму нанесла агрэсіўная балельшчыца, якая ўваткнула яму ў спіну парасон.**

**● ЭПІДЭМІЯ РЭКОРДАЎ, якія можна смела назваць ідыёцкімі, прымусіла ірландца Майка Міні шэсцьдзесят дзён правесці ў гробе, закапаным у зямлю на глыбіню паўтара метра. Страву ён атрымліваў праз трубку. У гроб была праведзена электрычнасць, так што «жывы мяртвяк» змог нават сфатаграфаваць самога сябе.**

**● НА ФРАНЦУЗСКІМ блакітным беразе пачала функцыяніраваць першая ў свеце падводная паліцыя. Неабходнасць яе стварэння выклікана тым, што аквалангісты-браканьеры, парушаючы правілы падводнага палявання, па-драпежніцку знішчаюць рыбу. Супрацоўнікі падводнай паліцыі праходзяць спецыяльную падрыхтоўку: яны павінны умець скакаць з верталёта ў ваду да глыбіні ў сорак метраў.**

**Адказны рэдактар М. І. ІОСЬКА.**

АТ 06926 **Адрас рэдакцыі: г. Мінск, Універсітэцкі гарадок, галоўны корпус, п. 106 Т-22-07-19. Друкарня выдавецтва «Звязда».** Тыраж 2000 экз. Заказ. 859.